БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
**УПРАЎЛЕННЕ КУЛЬТУРЫ**

БРЕСТСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
**УПРАВЛЕНИЕ КУЛЬТУРЫ**

# ЗАГАД / ПРИКАЗ

08.07.2025 № 29

г. Брэст / г.Брест

Аб правядзенні абласнога
конкурсу выяўленчага мастацтва
“Арт-палітра”

На падставе пункта 4 артыкула 210 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры і ў адпаведнасці з пералікам рэгіянальных цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў, якія праводзяцца на тэрыторыі Брэсцкай вобласці, якія фінансуюцца з абласнога бюджэту ў 2025 годзе, зацверджанным рашэннем Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта ад 12 лютага 2025 г. № 114,

ЗАГАДВАЮ:

1. Правесці ў кастрычніку-лістападу 2025 г. на базе ўстановы адукацыі “Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў” абласны конкурс выяўленчага мастацтва “Арт-палітра” (далей – конкурс).

2. Зацвердзіць:

2.1. парадак арганізацыі і правядзення конкурсу (дадаецца);

2.2. склад арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні конкурсу згодна дадатку.

3. Забяспечыць фінансаванне заключных мерапрыемстваў конкурсу за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных упраўленню культуры на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў.

4. Кантроль за выкананнем дадзенага загаду ўскласці на загадчыка сектарам устаноў адукацыі і кадравай работы ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Свідуновіч Л.А. і дырэктара ўстановы адукацыі “Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў” Ліпко А.С.

Начальнік упраўлення
культуры С.Б.Панасюк

21. Свідуновіч 35 09 22

Дадатак
да загаду начальніка
ўпраўлення культуры
Брэсцкага абласнога
выканаўчага камітэта
______________№_______

СКЛАД
арганізацыйнага камітэта
па падрыхтоўцы і правядзенні
абласнога конкурсу
выяўленчага мастацтва
«Арт-палітра»

| | |
|---|---|
| Панасюк Сяргей Барысавіч | начальнік упраўлення культуры Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта, старшыня арганізацыйнага камітэта |
| Ліпко Анатолій Сяргеевіч | дырэктар установы адукацыі «Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў» |
| Свідуновіч Лілія Аляксееўна | загадчык сектара навучальных устаноў і кадравай работы ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама |
| Члены арганізацыйнага камітэта: | |
| Крыштопчык Таццяна Мікалаеўна | намеснік дырэктара па АДВ УА «Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў» |
| Качаноўская Аксана Міхайлаўна | кіраўнік практыкі УА «Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў» |
| Стахавец Алена Анатольеўна | старшыня цыклавой камісіі дызайна УА «Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў» |

ЗАЦВЕРДЖАНА
Прыказ упраўлення культуры
Брэсцкага аблвыканкама
_________№____________

Парадак арганізацыі і правядзення
абласнога конкурсу
выяўленчага мастацтва
«Арт-палітра»

1. Арганізатарамі абласнога конкурсу выяўленчага мастацтва «Арт-палітра» (далей – конкурс) з’яўляюцца ўпраўленне культуры Брэсцкана аблвыканкама і ўстанова адукацыі «Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў».
2. Асноўнымі мэтамі конкурсу з’яўляюцца:
выяўленне і падтрымка адораных дзяцей і таленавітай моладзі, межрэгіянальны абмен творчымі дасягненнямі ў вобласці выяўленчага мастацтва;
актывізацыя работы ў напрамку мастацка-эстэтычнага выхавання;
садзейнічанне ў прафесійнай арыентацыі выпускнікоў установ дадатковай адукацыі і агульнаадукацыйных школ.
развіцце і ўдасканаленне камунікацый паміж установамі адукацыі.
3. У конкурсе могуць прымаць удзел навучэнцы ўстаноў дадатковай адукацыі Міністэрства культуры і ўстаноў адукацыі сістэмы Міністэрства адукацыі (далей канкурсанты).
4. Для непасрэднага кіравання правядзеннем конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей камітэт).
5. Аргкамітэт:
ажыццяўляе кіраванне падрыхтоўкай і правядзеннем конкурсу;
разглядае і зацвярджае склад журы конкурсу;
узаемадзейнічае з зацікаўленымі суб’ектамі культурнай дзейнасці і іншымі арганізацыямі па пытаннях падрыхтоўкі, правядзення і асвятлення конкурсу ў сродках масавай інфармацыі;
вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе падрыхтоўкі і правядзення конкурсу.
5.1. Пасяджэнні аргкамітэту лічацца правамоцнымі, калі ў іх прымае ўдзел не менш за дзве трэці яго складу. Рашэнні аргкамітэту прымаюцца адкрытым галасаваннем і лічацца прынятымі, калі за іх прагаласавала больш паловы членаў аргкамітэту з прысутных на пасяджэнні. Рашэнне аргкамітэту афармляецца пратаколам, які падпісвае старшыня аргкамітэту.

6. Умовы правядзення конкурсу.

6.1. Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца навучэнцы ўстаноў дадатковай адукацыі і агульнаадукацыйных школ ва ўзросце:

- першая ўзроставая катэгорыя 11-13 гадоў,
- другая ўзроставая катэгорыя 14-16 гадоў.

Узрост удзельнікаў конкурсу вызначаецца па стане на дату пачатка правядзення конкурсу.

6.2. Конкурс праводзіцца з *21 кастрычніка па 5 лістапада 2025г.*

6.3. Парадак правядзення конкурсу складаецца з двух этапаў:

*Першы этап:*

Агляд-конкурс творчых работ тэматычнай кампазіцыі «Мая спадчына». Фармат А-3.

Кожнаму ўдзельніку конкурсу неабходна адправіць самастойна выкананую работу, якая павінна быць аформлена на картоне і падпісана на самым экспанаце, або з прымацаваным з адваротнага боку ярлычком, па форме згодна з дадаткамі да сапраўдных умоў (дадатак2). Работы прымаюцца да 20 кастрычніка 2025г. (уключна).

Вынікі першага этапу будуць абвешчаны 27 кастрычніка 2025г. на сайце каледжа: artpinsk.by. Канкурсанты, якія набралі найбольшую колькасць балаў (не больш за 10 чалавек у кожнай узроставай катэгорыі), запрашаюцца да ўдзелу ў другім этапе 5 лістапада 2025г.

*Другі этап:*

Выкананне ўдзельнікамі творчых работ (на базе каледжа):

- Малюнак

*першая ўзроставая катэгорыя*: нацюрморт з прадметаў быту і геаметрычнага цела. Фармат А-3. Тэрмін выканання работы – 5 акадэмічных гадзін.

*другая ўзроставая катэгорыя*: нацюрморт з прадметаў быту і гіпсавая разетка. Фармат А-3. Тэрмін выканання работы – 6 акадэмічных гадзін.

6.4. Для ўдзелу ў конкурсе асобна канкурсант або ўстанова адукацыі, у якой ён навучаецца, накіроўвае наступныя матэрыялы:

- запоўненую электронную форму заяўкі;
- копію дакумента, які сведчыць асобу (пашпарт або пасведчанне аб нараджэнні);
- фатаграфію ўдзельніка.

6.5.Месца правядзення конкурсу: горад Пінск, вуліца Веры Харужай, 12, УА «Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў».

6.6. Заяўкі на ўдзел у конкурсе прымаюцца да *10 кастрычніка 2025г.* (уключна). Форма заяўкі прыкладаецца *(дадатак1).* Усе матэрыялы прадстаўляюцца ў электронным выглядзе як дададак да формы заяўкі на электонную пошту len4ik.stax@yandex.by. Пытанні на конт заяўкі і ўдзелу ў конкурсе па кантактных тэлефонах: +375293390321 (Стахавец Алена Анатольеўна).

6.7.Транспартныя выдаткі, размяшчэнне і харчаванне ўдзельнікаў і суправаджаючых асоб - за кошт сродкаў накіруючай арганізацыі.
6.8. Для стварэння твораў удзельнікі павінны мець свае неабходныя прылады: алоўкі і іншыя мастацкія матэрыялы.
7. Для прафесійнай ацэнкі канкурсантаў аргкамітэт зацвярджае склад членаў журы конкурсу (далей журы).
7.1.Журы:
ацэньвае прафесійны і творчы ўзровень работ удзельнікаў;
афармляе пратаколы вынікаў галасавання на другім этапе конкурсу;
конкурсу і прадстаўляе іх спіс у аргкамітэт для ўзнагароджання;
інфармуе канкурсантаў аб выніках іх удзелу ў конкурсе.
7.2.Ацэнка работ удзельнікаў конкурсу ажыццяўляецца па дваццацібальнай сістэме і ацэньваецца па наступных параметрах:
Малюнак
*рашэнне кампазіцыйнай задачы*;
*лінейна-канструктыўнае рашэнне малюнка пастаноўкі;*
*выяўленне аб’ёму прадметаў тонам;*
*валоданне тэхнікай малюнка*.
Кампазіцыя
*рашэнне кампазіцыйнай задачы*;
*раскрыццё тэмы задання*;
*каларыстычнае і танальнае рашэнне кампазіцыі*;
*арыгінальнасць мастацкага стылю*;
*валоданне сродкамі стылізацыі*;
*здольнасць вобразнага мыслення*;
*валоданне выяўленчай тэхнікай*.
7.3. Размеркаванне прызавых месцаў і спецыяльных прызоў адбываецца шляхам галасавання ўсіх членаў журы.
У выпадку, калі ў конкурсе прымае ўдзел вучань або сваяк члена журы, дадзены член журы абавязаны адмовіцца ад судзейства ва ўзроставай групе, дзе прымае ўдзел яго вучань (сваяк).
7.4. Рашэнні журы прымаюцца на пасяджэннях і афармляюцца пратаколамі, якія падпісваюць члены журы. Журы правамоцна прымаць рашэнне, калі на пасяджэнні прысутнічае не менш за дзве трэці ад яго поўнага складу. Рашэнне лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала больш паловы прысутных на пасяджэнні членаў журы. У выпадку роўнасцей галасоў, меркаванне старшыні журы з’яўляецца вырашальным. Рашэнні журы па кожнай з катэгорый і ўзроставых груп конкурсу абвяшчаюцца неўзабаве пасля заканчэння тэрміна выканання ўдзельнікамі творчых работ.
7.5. Пераможцы конкурсу ва ўсіх узроставых групах атрымліваюць дыпломы I, II і III ступені і каштоўныя прызы.

7.6. Журы мае права раздзяліць месца паміж канкурсантамі або не прысуждаць яго нікаму.
7.7.Канкурсанты, якія паказалі добрыя, але недастатковыя для дасягнення прызавых месцаў вынікі, атрымліваюць граматы ўдзельніка.
7.8. Настаўнікі пераможцаў атрымліваюць падзякі конкурсу.
8. Фінансаванне конкурсу ажыццяўляюцца згодна каштарысу выдаткаў за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных упраўленню культуры на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам. Усе фінансавыя разлікі пад час правядзення конкурсу на выснове кантрактаў і дагавораў ажыццяўляецца установай адукацыі "Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў".
9. Кантакты конкурсу:
Сайт каледжа**:** artpinsk.by
Тэлефон-факс: +375165650608
Фізічны адрас: установа адукацыі «Пінскі дзяржаўны каледж мастацтваў», вул. В.Харужай,12, 225710, г. Пінск.